# Нацыянальны стыль у архітэктуры БССР 1920-х гг.

**Пытанні захавання культурнай ідэнтычнасці ў архітэктуры падымаліся шмат разоў у XIX–XX стст., іх актуальнасць захоўваецца і сёння, асабліва як сродак супрацьстаяння ўплыву глабалізацыі і ўніверсалізму. У розныя перыяды праблемы рэпрэзентацыі самабытнасці і ўнікальнасці нацыянальнага у дойлідстве вырашаліся зыходзячы з традыцый, назапашаных культурай, а таксама з актуальнага стану і напрамкаў развіцця сусветнай архітэктуры, у тым ліку дамінуючых у ёй стыляў.**



**Ілля Вярбіла,**
суіскальнік адзела архітэктуры Інстытута мастацтвазнаўства, этнафграфіі і фальклору імя. К. Крапівы НАН Беларусі

У пачатку XX ст. у еўрапейскіх дзяржавах хутка змяняліся сацыяльна-палітычныя ўмовы, з'яўляліся новыя архітэктурныя школы і падыходы: гістарызм і мадэрн існавалі побач з новымі рацыяналістычнымі напрамкамі. Адначасова пасля Першай сусветнай вайны і распаду імперый у Еўропе ўзніклі новыя дзяржавы, дзе архітэктура стала сродкам нацыянальнага самавыражэння. Менавіта ў іх найбольш яскрава назіралася імкненне даць адказ на нацыянальнае пытанне: архітэктары – прадстаўнікі школ розных краін, якія раней не мелі ўласнай дзяржаўнасці, у 1920-я гг. праходзілі запознены перыяд нацыянальнага рамантызму, у выніку чаго ўзнікалі новыя стылі архітэктуры.

Адказваючы на пытанне аб неакрэсленасці паняцця «нацыянальны стыль», магчымасці яго візуальнага параўнання з іншымі гістарычнымі стылямі (неаготыкай, эклектыкай), варта адзначыць, што ў сучаснай навуцы гэта з'ява не разглядаецца выключна як візуальнае адзінства форм, а хутчэй як адзінства прынцыпаў формаўтварэння. Вылучыць пэўны стыль можна пры прымяненні да ўстойлівых асаблівасцяў элементаў архітэктуры асобнага народа, дзяржавы ці тэрыторыі, якія з'яўляюцца характэрнымі для яе ў той ці іншы перыяд [1]. Стыль вызначаецца не толькі як форма ці кампазіцыйны прынцып будынкаў, якія паўтараюцца ў шматлікіх збудаваннях, але і як агульнасць ідэйнага і каштоўнаснага сэнсу, які ў іх укладаюць стваральнікі.

На падобных прынцыпах грунтуецца і разуменне паняцця «беларускі стыль», якое абапіраецца на ідэйныя ўяўленні аб найбольш характэрных рысах айчыннага дойлідства і якое ў агульных рысах было ўласцівае мастацтвазнаўцам – супрацоўнікам Інстытуту беларускай культуры (Інбелкульту) у 1920-я гг. Адначасова трэба падкрэсліць недаследаванасць гэтага феномену, або архітэктуры нацыянальнага рамантызму БССР 1920-х гг., у сучаснай гістарыяграфіі. Паспрабуем асвятліць

асаблівасці падыходаў да гэтага пытання, вылучыць асноўныя ідэі і метады візуальнай рэпрэзентацыі, вызначыць погляды навукоўцаў і архітэктараў, датычных да гэтага працэсу, а таксама прывесці прыклады практычнай рэалізацыі праектаў у беларускім стылі згаданага перыяду.

## Інбелкульт і тэорыя нацыянальнага архітэктурнага стылю ў БССР

Пасля ўзнікнення БССР беларуская культура атрымала сістэмную падтрымку з боку дзяржавы: былі заснаваны навукова-даследчыя і культурныя ўстановы, распачаўся працэс беларусізацыі. Тэмпы культурнага развіцця рэзка ўзраслі на падмурку, які айчынныя культурныя дзеячы закладалі ў канцы XIX – пачатку XX ст., што прыводзіла да росквіту нацыянальнага тэатру, музыкі і жывапісу. Творцы атрымалі магчымасць свабодна працаваць у беларускім культурным полі.

Пытанне нацыянальнай выразнасці ў архітэктуры не было характэрным толькі для БССР: у іншых рэспубліках СССР у гэты час адбываліся падобныя працэсы. Маштабы з'явы былі рознымі, на іх уплывалі наяўнасць у краінах уласнай архітэктурнай школы і ўстаноў вышэйшай адукацыі. Варта адзначыць, што спрыяльны фон стварала падтрымка з боку дзяржаўных даследчых інстытутаў, а таксама асобных архітэктараў і мастацтвазнаўцаў. Да канца 1920-х гг. яны мелі магчымасць адносна свабодна трактаваць сутнасць і меру нацыянальных кампанентаў у культуры. Тэндэнцыя звароту да іх у 1920–1930-х гг. была агульнаеўрапейскай. Моцным уплывам народнага стылю ў архітэктуры характарызаваліся таксама Польшча, Балгарыя, Румынія, Югаславія [2].

Распрацоўка пытанняў беларускага стылю ў архітэктуры ў навастворанай БССР набыла інстытуцыянальны характар у дзейнасці Інбелкульту. Менавіта вакол гэтай структуры сканцэнтраваліся навуковыя кадры, якія займаліся тэарэтычнымі пытаннямі мастацтва і архітэктуры, і менавіта яны ў рэчышчы працэсу беларусізацыі, які распачаўся ў сярэдзіне 1920-х гг., пачалі рабіць захады па практычным выкарыстанні нацыянальных ідэй у будаўніцтве.

Беларускае мастацтвазнаўства становіцца на сістэмныя навуковыя рэйкі дзякуючы шэрагу даследчыкаў беларускай архітэктуры і мастацтва – М.М. Шчакаціхіну, І.М. Хозераву, М.І. Каспяровічу, П.М. Красавіцкаму і інш. Секцыя мастацтваў Інбелкульту пачала працаваць у лютым 1925 г. у кірунку пошукаў беларускага стылю. Яе падсекцыя выяўленчых мастацтваў на чале з пачынальнікам беларускага навуковага мастацтвазнаўства М.М. Шчакаціхіным занялася пытаннямі жывапісу, скульптуры і архітэктуры. Адным з асноўных напрамкаў працы было вывучэнне беларускага стылю і самабытных форм архітэктуры. Было прапанавана таксама афіцыйнае азначэнне беларускага мастацтва як комплекснай з'явы, якая злучае старое мастацтва гарадоў Беларусі, этнаграфічнае народнае і сучаснае індывідуальнае. У гэткім разуменні мелася на ўвазе доўгая гісторыя і выпрацаваныя за стагоддзі фармальныя і стылістычныя рысы, якія адлюстроўвалі нацыянальныя асаблівасці [3].

У межах падсекцыі выяўленчых мастацтваў была арганізавана Камісія беларускага стылю, якая вяла даследаванні напрамкаў, арнаменту і самабытных формаў архітэктуры. Менавіта па выніках працы гэтай камісіі, а таксама Архітэктурнай камісіі Інбелкульту і стала магчымай практычная рэалізацыя пэўных праектаў з нацыянальнымі рысамі. У сярэдзіне 1920-х гг. Інбелкульт атрымаў значную палітычную вагу ў БССР і сам мог ініцыяваць разгляд пытанняў агульнадзяржаўнага значэння, такіх як, напрыклад, пытанне знешняга выгляду будучай забудовы беларускіх гарадоў [4].

Часткай практычнага ўхілу Інбелкульту была праца Камісіі архітэктурнага стылю, ажыццяўляўшая сярод іншага экспертызу праектаў новых буйных будынкаў. У 1925 г. была прынята праграма дзейнасці падсекцыі выяўленчых мастацтваў, якая падзялялася на тэарэтычны і практычны напрамкі [5]. Побач з апісаннем архітэктурных помнікаў і тэарэтычным вывучэннем гісторыі беларускай архітэктуры пэўных перыядаў былі вызначаны канкрэтныя аспекты працы і ўзаемадзеяння з дзяржаўнымі ўстановамі. Сярод іх – аб'яднанне ўсіх мастацкіх сілаў БССР для «адшукання і ўтварэння згодна сучаснасці беларускага нацыянальнага стылю» [5]. Адным з накірункаў пазначана ўсталяванне сувязей з дзяржаўнай прамысловасцю з мэтай актыўнага выкарыстання нацыянальна-мастацкіх элементаў у аздабленні прамысловых вырабаў, у тым ліку ў будаўніцтве. У дакументах Дзяржплана БССР ёсць звесткі аб прапанове Інбелкульту ў 1926 г. аб больш цесным супрацоўніцтве і зафіксавана рашэнне аб стварэнні асобнай камісіі для каардынацыі ў прамысловай сферы [6]. Па заданнях інстытуту працавалі архітэктары Ч.А. Родзевіч і С.С. Гайдукевіч.

Апошняму было даручана распрацаваць праект дэкаратыўнага аздаблення інтэр'еру канферэнц-залы ў будынку Інбелкульту [7].

Найбольшы ўнёсак у вывучэнне гісторыі беларускай архітэктуры і яе характэрных рыс зрабіў М.М. Шчакаціхін, які лічыцца пачынальнікам айчыннага мастацтвазнаўства. Навуковец сфармуляваў агульнае бачанне гэтай самабытнай з'явы. У 1928 г. была выдана яго манаграфія «Нарысы з гісторыі беларускага мастацтва», у якой была акрэслена гістарычная канцэпцыя нацыянальнага архітэктурнага стылю. Дадзены напрамак у разуменні асаблівасцяў беларускай архітэктуры шмат у чым трымаўся на канцэпцыі «залатога XVI стагоддзя», падчас якога самабытная нацыянальная культура дасягнула найбольшага росквіту. Такія погляды былі замацаваны ў артыкуле для Вялікай савецкай энцыклапедыі, падрыхтаваным у 1927 г. М.М. Шчакаціхіным, які адзначаў, што «найбольшай мастацкай выразнасці і стылявой незалежнасці дасягнула беларуская архітэктура ў канцы XV – пачатку XVI ст. у познегатычных пабудовах» [8]. Даследчык лічыў, што нацыянальны стыль нельга штучна стварыць ці прыдумаць, ён сам нараджаецца і выспявае ў рэчышчы развіцця айчыннай і сусветнай культуры. Таму распрацоўваць новую архітэктуру можна выключна грунтуючыся на векавых гістарычных набытках, якія фарміраваліся паступова і арганічна цягам стагоддзяў. Нацыянальны стыль павінен выяўляцца комплексна – у тэматыцы, форме і надворным убранні, а таксама выкарыстоўвацца не толькі для аздаблення, але мець пэўныя ідэі і трансліраваць іх у наваколле [9].

Альтэрнатыўным падыходам стаў другі, этнаграфічны напрамак у разуменні нацыянальнага стылю ў будаўніцтве. Характэрным для яго з'яўляецца выкарыстанне пэўных формаў сялянскіх хат і дэкору з геаметрычных і раслінных ткацкіх арнаментаў, найбольш распаўсюджанае ў пасляваенны час. Па этнаграфічнаму накірунку працы Інбелкульту таго перыяду адно з ключавых месцаў займаюць даследаванні народнага арнаменту ва ўсіх яго відах, што зафіксавана ў справаздачах. М. Шчакаціхін займаўся тэмай паходжання арнаменту, В. Ластоўскі складаў наменклатуру і альбом народнай арнаментыкі, мастак А. Тычына збіраў адпаведныя матэрыялы ў галіне беларускага драўлянага дойлідства [10]. У чэрвені 1925 г. супрацоўнік этнаграфічнай секцыі М.В. Мялешка канстатаваў распачаты актыўны працэс пошукаў беларускіх народных асаблівасцяў у мастацтве [11]. У гэты час мастакі звярталіся па дапамогу менавіта да этнографаў Інбелкульту, якія, на думку Мялешкі, маглі б зрабіць значна больш для выкарыстання нацыянальных мастацкіх матываў у працы савецкіх устаноў. Асобна спыняецца Мялешка на пытанні традыцыйных формаў і колераў у народным дойлідстве, лічыць, што, сістэматызаваныя, яны б маглі стаць добрай крыніцай для натхнення ў сучасным будаўніцтве.

Грунтуючыся на захаваных дакументах Інбелкульту і іншых дзяржаўных устаноў, можна сказаць, што канцэпцыі і планы па ўкараненню нацыянальнага стылю ў архітэктуры не засталіся толькі на паперы. Супрацоўнікі розных секцый інстытута разам з архітэктарамі сістэматычна распрацоўвалі тэарэтычныя пытанні беларускага архітэктурнага стылю, фармулявалі падыходы да яго разумення і ўрэшце зрабілі магчымай практычную рэалізацыю будынкаў з нацыянальнымі рысамі. Найбольш актыўнай і паспяховай гэтая дзейнасць была ў сярэдзіне 1920-х гг., калі намаганнямі супрацоўнікаў Інбелкульту і архітэктараў у БССР былі падрыхтаваны праекты і пабудаваны шэраг будынкаў, у якіх выкарыстоўваўся беларускі стыль.

## Практыка ўвасаблення нацыянальных рыс

Першай вядомай спробай шырокай дэманстрацыі нацыянальнага стылю беларускай архітэктуры ў савецкі перыяд стаў удзел БССР ва Усесаюзнай сельскагаспадарчай і саматужна-прамысловай выставе 1923 г. у Маскве. Згодна з канцэпцыяй галоўнага архітэктара выставы А. Шчусева, павільёны павінны былі адлюстроўваць рысы дойлідства розных рэспублік і рэгіёнаў. Падрыхтоўка да выставы, уключаючы конкурс на праект павільёна БССР, актуалізавала пытанне аб адметных рысах беларускай архітэктуры, пошукам адказаў на яго заняліся менавіта супрацоўнікі Інбелкульту.

У камісію па ацэнцы конкурсных праектаў увайшлі эксперты С.В. Скандракоў і А.А. Смоліч. Адным з ключавых крытэрыяў адбору было максімальнае выяўленне нацыянальных рыс беларускай архітэктуры. Пераможцам стаў праект «Мінск» аўтарства Г.В. Кірыка і К.Г. Ціханава *(мал. 1)*, які дэманстраваў спалучэнне элементаў розных стыляў, характэрнае для нацыянальных варыянтаў мадэрну (нearускі стыль, украінскі архітэктурны мадэрн, паўночны мадэрн і інш.) з дамінаваннем матываў беларускай замкавай архітэктуры.




*Мал. 1.* Конкурсны праект павільёна БССР аўтарства Г.В. Кірыка і К.Г. Ціханава. Крыніца: https://russianartarchive.net/ru/catalogue/document/D12504

Драўляныя сцены і вежы ў спалучэнні з масіўным каменным падмуркам не пакідаюць сумневаў у крыніцах натхнення аўтараў праекту, які з'яўляецца яскравым адлюстраваннем гістарычнага напрамку разумення беларускага стылю ў архітэктуры.

Аднак у выніку быў рэалізаваны іншы праект аўтарства расійскага архітэктара А.З. Грынберга, які таксама імкнуўся зрабіць павільён найбольш беларускім па выгляду, але падышоў да пытання з боку этнаграфічнай трактоўкі нацыянальнага стылю. Агульны план нагадваў вялікую сялянскую хату, шматузроўневая страха адсылала да традыцыйнага драўлянага храмавага дойлідства Беларусі, нагадвала страху капліцы ці царквы [12]. Павільён быў цалкам драўляны, звонку і знутры аздоблены ўпрыгожаннямі з матывамі беларускага арнаменту. Такім чынам, ужо ў 1922–1923 гг. у праектах беларускай архітэктуры існавалі абодва варыянты трактоўкі нацыянальнага стылю: гістарычны і этнаграфічны.

Найбольш маштабнае будаўніцтва ў першым напрамку было рэалізавана ў сярэдзіне 1920-х гг. на чыгунцы. Планы прадугледжвалі збудаванне трох ключавых вакзалаў у беларускім стылі: галоўнага ў Мінску (на месцы былога Брэсцкага), а таксама вакзалаў на памежных станцыях Негарэлае і Бігосава. Два апошнія былі завершаны. Будаўніцтва новага вакзала ў сталіцы шырока асвятлялася ў прэсе. Праект быў распрацаваны прызнаным майстрам мадэрну, маскоўскім архітэктарам І.І. Струкавым, аўтарам Беларускага вакзала ў Маскве (1912 г.). Праектаванне было завершана ў студзені 1926 г., але архітэктурная камісія Інбелкульту ўнесла значныя праўкі, каб наблізіць стыль да беларускіх камяніц XVI ст. – перыяду найвышэйшага росквіту самабытных формаў, у адпаведнасці з гістарычнай трактоўкай нацыянальнага стылю М. Шчакаціхіна [13]. Перапрацаваны праект камісія прызнала вельмі ўдалым, адзначыўшы, што ён узбагаціць Мінск першай буйной камяніцай у добра вытрыманым беларускім стылі. Аднак спачатку з-за фінансавых праблем, а потым у выніку змен горадабудаўнічых канцэпцый будаўніцтва вакзалу было адменена ўвогуле, і ў горадзе застаўся адзін пасажырскі вакзал.

Адзіным захаваным у першапачатковым выглядзе прыкладам міжваеннага збудавання ў беларускім архітэктурным стылі з'яўляецца пасажырскі вакзал на станцыі Бігосава *(мал. 2)*, пабудаваны ў 1926–1927 гг. Будынак мае сіметрычную кампазіцыю: выцягнуты па восі, з плаўным



*Мал. 2.* Сучаснае фота пасажырскага вакзала на станцыі Бігосава. Крыніца: https://my-places.by/be/places/bigosovo-zheleznodorozhnaya-stanciya

зніжэннем вышыні ад цэнтра з вежамі і шпілем да бакавых крылаў. Манументальныя формы, нішы, зубцы і груваcткасць аб'ёмаў адсылаюць да абарончага дойлідства Беларусі, своеадметнай беларускай готыкі. Цікавасці будынку дадае таксама і выкарыстанне розных матэрыялаў у кладцы – цэгла чаргуецца з дрэвам. Можна думаць, што адной з галоўных ідэй была тэма памежнасці беларускіх зямель і вялікага ўплыву гэтага палітычна-геаграфічнага становішча на культуру. У выпадку з памежнымі станцыямі гэтую ідэю падкрэслівае і іх функцыянальнае прызначэнне ў выглядзе сімвалічных памежных замкаў дзяржавы. Можна лічыць, што знешні выгляд будынку заснаваны на поглядах М. Шчакаціхіна («Нарысы з гісторыі беларускага мастацтва»), дзе ён вылучаў абарончыя храмы ў Сынкавічах, Маламажэйкаве (Мураванцы) і Супраслі як дасканалыя прыклады самабытнай беларускай архітэктуры.

Амбітныя планы па выкарыстанні нацыянальных рыс існавалі і ў Народным камісарыяце асветы БССР. У архітэктуры іх планавалася выкарыстаць пры ўзвядзенні комплексу Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта ў Мінску. У 1926 г. Маскоўскае архітэктурнае таварыства правяло ўсесаюзны конкурс, ва ўмовах якога было пазначана абавязковае патрабаванне адлюстраваць беларускія мастацкія формы ў кампазіцыі, фасадах і інтэр'ерах [14]. Сам факт такога патрабавання быў нязвыклай з'явай, таму супрацоўнікі Інбелкульту разам з загадчыкам будаўнічай камісіі БДУ падрыхтавалі спецыяльныя інфармацыйныя брашуры па беларускім архітэктурным стылі. Аднак, паводле сведчанняў беларускага архітэктара Я.А. Мазгалеўскага, праектаў у вызнаваным накірунку было няшмат, і да конкурснага разгляду ў Маскве яны не былі дапушчаны.

Наркамат асветы збіраўся шырока выкарыстоўваць беларускі стыль у праграме па ўзвядзенню школ. Напрыклад, у 1926 г. існавалі планы пабудовы навучальных устаноў у адпаведным стылі з бетонных блокаў у мінскім раёне Ляхаўка [15]. Аднак праект рэалізавалі без нацыянальных рыс, а маштабнае выкарыстанне беларускага стылю ў тыпавым будаўніцтве не было ўвасоблена ў жыццё.

Уплыў ідэй беларускасці адчуваўся і ў будаўніцтве на вёсцы. Сістэмнасць гэтай з'явы можна прасачыць па згадках нацыянальнага стылю ў нарматыўных дакументах: «Правілы па будаўніцтву ў сельскай мясцовасці» і «Праграма архітэктурнага конкурсу на тыпавыя праекты па калгасным і пасялковым будаўніцтве» патрабавалі адлюстравання характэрных беларускіх архітэктурна-мастацкіх форм з улікам эканамічнага іх увасаблення [16].

Этнаграфічная трактоўка праявілася ў спробах выкарыстаць народныя матывы ў праектах тыпавога жытла: на Юбілейнай выстаўцы мастацтва народаў СССР (1927 г., Масква) ад БССР былі прадстаўлены праекты жылых будынкаў для працоўных і сялян аўтарства маладога архітэктара І.І. Валадзько. У беларускім друку яго праекты атрымалі станоўчую ацэнку, аднак у агульнасаюзнай прэсе былі сустрэты адмоўна [17]. Невялікія драўляныя будынкі мелі разьбяныя элементы аздаблення, характэрныя для традыцыйнага дойлідства, якія спалучаліся з канструктывісцкімі формамі. Варта адзначыць, што ў 1940–1950-я гг. І.І. Валадзько працягнуў працу па вылучэнню беларускіх нацыянальных рыс у архітэктуры.

Шматлікія элементы выкарыстоўваліся і ва ўнутраным аздабленні будынкаў культурнага прызначэння (музеі, кінатэатры, клубы). У будынку Дзяржаўнага музею БССР у Мінску восенню 1926 г. з'явіліся ўнутраныя роспісы ў беларускім стылі *(мал. 3)*. На сценах, калонах і скляпеннях былога архірэйскага падвор'я паверх гістарычных роспісаў паўсталі «кутасы




*Мал. 3.* Роспіс будынку Дзяржаўнага музею БССР. Крыніца: Наш край. 1927. №1

мастацка падабраных беларускіх арнаментаў» [18]. Столь, зводы і калоны былых царкоўных залаў былі пабеленыя і упрыгожаныя шматлікімі відамі і тыпамі народнага беларускага геаметрычнага арнаменту. Падобны роспіс меўся і ў філіяле Дзяржаўнага музею ў Віцебску – былым будынку гарадской Думы.

Значную ролю ў стварэнні нацыянальнага стылю адыграў калектыў Віцебскага мастацкага тэхнікуму, які пад кіраўніцтвам Інбелкульту займаўся ў тым ліку дэкараваннем інтэр’ераў. У 1924 г. быў выкананы роспіс залы кінатэатру «Мастацкі кінематограф» у Віцебску калектывам на чале з М. Эндэ, А. Волкавым і М. Керзіным. Столь галоўнай залы запоўнілі арыгінальным варыянтам народнага арнаменту ў смарагдавым і аранжавым колерах.

З пачатку 1930-х гг., у абставінах больш жорсткага партыйнага кантролю над культурнай сферай, працы па стварэнні беларускага стылю ў архітэктуры былі згорнуты. Аднак асобныя спробы рэалізацыі тэзісу аб культуры, «нацыянальнай па форме і сацыялістычнай па зместу», захаваліся ў этнаграфічным падыходзе. Ад комплекснага нацыянальнага стылю засталося выкарыстанне народнага геаметрычнага арнаменту ў аздабленні асобных збудаванняў, спалучэнне яго з савецкай неакласікай *(мал. 4)*.



*Мал. 4.* Дошка гонару ў Мінску. Крыніца: Мінск незнаёмы, 1920–1940: [фотаальбом] / аўтар-укладальнік Ілля Куркоў. Мінск, 2002

Такім чынам, 1920-я гг. у гісторыі беларускай культуры адзначаны бурным росквітам усіх кірункаў мастацтва, моцны штуршок развіцця атрымала і архітэктура разам з выхадам на дзяржаўны ўзровень пытання аб нацыянальным стылі, якое да гэтага разглядалася толькі асобнымі навукоўцамі і архітэктарамі. Дзякуючы папулярызацыі і актыўнай падтрымцы Інбелкульта, Наркамата асветы і іншых устаноў у яго рашэнне ўключыліся шматлікія спецыялісты. Як бачна з прыкладаў Наркамата асветы і Наркамата шляхоў зносін, разуменне важнасці шырокага ўкаранення нацыянальнага стылю ў сучаснае будаўніцтва было не толькі ў навукоўцаў і мастакоў.

Актуальныя ў той перыяд ідэі яскрава дэманструюць уключанасць БССР у агульнаеўрапейскія працэсы эвалюцыі архітэктуры. Менавіта ў 1920-я гг. беларускія архітэктары, як і іх калегі з краін Еўропы, атрымалі магчымасць узводзіць будынкі з выразнымі нацыянальнымі рысамі пры падтрымцы мясцовага кіраўніцтва. Самабытныя мастацтва і архітэктура разглядаліся супрацоўнікамі Інбелкульту як неабходны чыннік самавызначэння народа, яго візуальна-прасторавая рэпрэзентацыя. Не толькі канструктывізм як савецкі варыянт напрамку функцыяналізму прысутнічае ў якасці агульнаеўрапейскай архітэктурнай з’явы на беларускіх землях. Праца па стварэнню нацыянальнага стылю архітэктуры ў БССР, нягледзячы на малую колькасць пабудаваных аб’ектаў і невялікі час актыўнай распрацоўкі тэарэтычных пытанняў, пакінула значны след. Архітэктары вярталіся да гэтай тэмы і ў наступныя гістарычныя перыяды, спрабавалі выкарыстоўваць нацыянальныя матывы адпаведна веянням часу і дамінуючым напрамкам.


**СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ**

1. Морозов Е.В. Функционализм как феномен европейской архитектуры и его распространение на белорусских землях в 1920–1930-х гг. / Е.В. Морозов // Архитектура: сб. науч. трудов / Министерство образования Республики Беларусь, БНТУ. Минск, 2013. Вып. 6. С. 44–49.
2. Архітэктура Беларусі / Нацыянальная акадэмія навук Беларусі, Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы. Т. 4, кн. 2: XX – пачатак XXI ст.; рэдкал.: А.І. Лакотка і інш. – Мінск, 2009.
3. Белорусская культура / Белорусское общество культурной связи с заграницей. – Минск, 1928.
4. Груша А. Институт белорусской культуры в 1925 – первой половине 1926 г.: открывающиеся перспективы / А. Груша // Наука и инновации. 2022. №4. С. 65–70.
5. Архіў НАН. Ф. 67. Воп. 1. Спр. 24.
6. НАРБ. Ф. 31. Воп. 1. Спр. 86.
7. Архіў НАН. Ф. 67. Воп. 1. Спр. 11.
8. Ліс А. Мікола Шчакаціхін: харавство непазнанай зямлі / А. Ліс. – Мінск, 1968.
9. Шчакаціхін М.М. Сучаснае мастацтва ў Беларусі / М.М. Шчакаціхін // Полымя. 1926. №6. С. 130–148.
10. Архіў НАН. Ф.67. Воп. 1. Спр. 23.
11. На пути к Академии наук, 1922–1928 / НАН Беларуси, Центральная научная библиотека им. Якуба Коласа. – Минск, 2023.
12. Грунтоў С. Забытая экспедыцыя 1923 года: ля вытокаў акадэмічнай этнаграфіі ў Беларусі: альбом-манаграфія / С. Грунтоў, Я. Грыневіч, Н. Саўчанка. – Мінск, 2023.
13. Мастацкія весткі // Савецкая Беларусь. 1926. 12 студзеня. С. 8.
14. Конкурсы 1923–1926 / МАО. – М., 1927.
15. НАРБ. Ф. 7. Воп. 1. Спр. 403.
16. Программа архитектурного конкурса на составление типовых проектов по колхозному и поселковому строительству / Народный комиссариат земледелия БССР. – Минск, 1928.
17. БДАНТД. Ф. 105. Воп. 1. Спр. 46.
18. Дзе раней гучэлі царкоўныя званы // Савецкая Беларусь. 1926. 12 верасня. С. 5.